Таким образом, проекты в сфере организации семейного досуга – путешествие по местам Всемирного наследия ЮНЕСКО – могут стать эффективным средством укрепления и воспитания семьи и продвижения объектов историко-культурного наследия.


1. *Бирюкова, Т. П.* Роль социокультурной деятельности в организованном семейном досуге / Т. П. Бирюкова // Культура: открытый формат – 2013 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2013. – С. 333–337.

2. *Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учеб. пособие / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

3. *Козловская, Л. И.* Проблемы организации досуга семьи в условиях агрогородка / Л. И. Козловская // Культура: открытый формат – 2014 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2014. – С. 295–301.


УДК 338.483.11(476.7)


Л. М. Глiністая,

*група 450,*

*установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*


## ЭКАЛАГІЧНЫ ТУРЫЗМ ЯК СПОСАБ ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ (на прыкладзе Нацыянальнага парку «Белавежская пушча»)

Экалагічны турызм – гэта падарожжа ў мясціны з адносна некранутай прыродай, арыентаванае на атрыманне ўяўленняў аб прыродных і культурна-этнаграфічных асаблівасцях дадзенай тэрыторыі. Такія вандроўкі не парушаюць цэласнасці экасістэм.

Канцэпцыю экатурызму можна прадставіць у выглядзе наступных базавых прынцыпаў:

– падарожжа ў прыроду, прычым галоўны змест такіх падарожжаў – знаёмства з жывой прыродай, а таксама з мясцовымі звычаямі і культурай;

– звядзенне да мінімуму негатыўных наступстваў экалагічнага і сацыяльна-культурнага характару, падтрыманне экалагічнай устойлівасці асяроддзя;

– садзейнічанне ахове прыроды і мясцоваму сацыякультурнаму асяроддзю;

– экалагічная адукацыя і асвета;

– удзел мясцовых жыхароў і атрыманне імі даходаў ад турыстычнай дзейнасці, што стварае для іх эканамічныя стымулы для аховы прыроды;

– эканамічная эфектыўнасць і ўклад ва ўстойлівае развіццё рэгіёнаў, якія наведваюць падарожнікі [1, с. 14].

Беларусь валодае велізарным прыродным патэнцыялам для развіцця экатурызму. Дзякуючы ўнікальнасці прыроды Беларусі ў краіне развіваюцца такія віды экалагічнага турызму, як экскурсіі (ладзяцца ў заказнікі рэспубліканскага значэння, запаведнікі, нацыянальныя паркі), экалагічныя маршруты (распрацоўваюцца з улікам зацікаўленняў аматараў актыўнага адпачынку), экасцежкі (ствараюцца з мэтай азнаямлення з наваколлем). Найбольш вядомыя аб’екты экалагічнага турызму – рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Ельня», Бярэзінскі біясферны запаведнік, Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», Нацыянальны парк «Нарачанскі», Нацыянальны парк «Белавежская пушча» і інш.

Нацыянальны парк «Белавежская пушча» з’яўляецца аб’ектам Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА і ўяўляе сабою адзін з найбуйнейшых лясных масіваў раўніннай Еўропы, які захаваўся да нашых дзён у адносна непарушаным стане. Яго тэрыторыя падзелена дзяржаўнай мяжой на дзве часткі – беларускую і польскую.

Развіццё рэкрэацыйна-турыстычнай дзейнасці на тэрыторыі нацыянальнага парку прадугледжвае рашэнне наступных задач:

– захаванне эталонных і ўнікальных прыродных комплексаў і аб’ектаў прыроды Белавежскай пушчы;

– арганізацыя экалагічнай асветы і выхавання насельніцтва;

– правядзенне навуковых даследаванняў, звязаных з распрацоўкай і ўкараненнем у практыку навуковых метадаў захавання біялагічнай разнастайнасці, вывучэннем прыродных аб’ектаў і комплексаў;

– распрацоўка і ўкараненне ў практыку навуковых метадаў аховы прыроды і прыродакарыстання;

– захаванне культурнай спадчыны;

– арганізацыя рэкрэацыйнай дзейнасці;

– вядзенне комплекснай гаспадаркі на аснове традыцыйных метадаў і перадавых дасягненняў прыродакарыстання.

У залежнасці ад ступені захаванасці прыродных комплексаў, іх прыродаахоўнай, аздараўленчай, навуковай, рэкрэацыйнай, гісторыка-культурнай, гаспадарчай і эстэтычнай каштоўнасці на тэрыторыі нацыянальнага парку вылучаюцца запаведная зона, зона рэгуляванага выкарыстання, рэкрэацыйная і гаспадарчая зоны.

Запаведная зона нацыянальнага парку прызначана для захавання ў натуральным стане прыродных комплексаў і аб’ектаў для забеспячэння ўмоў іх адпаведнага развіцця. Зона рэгуляванага выкарыстання Нацыянальнага парку прызначана для захавання комплексаў і аб’ектаў асобных экасістэм прыродных і гісторыка-культурных помнікаў і аб’ектаў, а таксама для забеспячэння ўмоў іх натуральнага развіцця і аднаўлення.

Рашэннем ЮНЕСКА ад 14 снежня 1992 г. Белавежская пушча была ўключана ў Спіс прыродных аб’ектаў Сусветнай спадчыны як адзіная трансгранічная тэрыторыя разам з Белавежскім нацыянальным паркам (Рэспубліка Польшча), які быў унесены ў гэты спіс у 1977 г. Згодна з Канвенцыяй па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, прынятай ЮНЕСКА ў 1972 г., у гэты Спіс уключаюцца найбольш значныя і ўнікальныя прыродныя аб’екты свету, што з’яўляецца найвышэйшым прыродаахоўным статусам [2].

Белавежская пушча мае вялікі патэнцыял для развіцця экатурызму. У Нацыянальным парку праводзяцца экскурсіі, накіраваныя на падтрымку і захаванне ўнікальных прыродных помнікаў і аб’ектаў. Штогод там ладзяцца аглядныя экскурсіі з наведваннем музея, вальераў з зубрамі і іншымі «жыхарамі».

У Нацыянальным парку «Белавежская пушча» ёсць веламаршруты, што з’яўляецца добрай падставай для развіцця экалагічнага турызму. Яны пераважна накіраваны на тое, каб прадэманстраваць унікальнасць і прыгажосць Белавежскай пушчы. Веламаршруты – гэта адзін з найлепшых відаў экалагічнага турызму, яны не шкодзяць прыродзе, і гэта садзейнічае захаванню ўнікальных прыродных аб’ектаў.

У нацыянальным парку прадстаўлены такі від экалагічнага турызму, як пешыя маршруты, што дазваляюць наведаць унікальныя куткі Белавежскай пушчы, арганізаваны для наведвальнікаў і веласіпедна-пешаходныя маршруты, якія таксама садзейнічаюць захаванню ўнікальный прыроды.

Усе вышэйадзначаныя маршруты (пешыя, веламаршруты, веласіпедна-пешаходныя), арганізаваныя ў Белавежскай пушчы, маюць лакальны характар. На аснове Белавежскай пушчы можна ствараць экалагічныя маршруты і туры рэспубліканскага значэння, якія павінны ўключаць іншыя аб'екты прыроднай і культурнай спадчыны. Такога кшталту турыстычная дзейнасць будзе садзейнічаць развіццю экалагічнага турызму ў краіне, узаемадзеянню аб'ектаў прыроднага і культурнага значэння, дапаможа прасоўваць гісторыка-культурную спадчыну, якая іграе важную ролю ў фарміраванні грамадзянскасці і патрыятызму.

Развіццю экалагічнага турызму і распаўсюджванню ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне садзейнічаюць сацыяльныя сеткі, якія прыцягваюць да наведвання прыродных і культурных аб'ектаў, дапамагаюць узаемадзейнічаць з імі, распрацоўваць кірункі падарожжаў з улікам запатрабаванняў турыстаў і ўвогуле ўздзейнічаюць на турыстычную індустрыю.

1. *Ажаев, Г. С.* Экологический туризм / Г. С. Ажаев. – Павладар : Кереку, 2016. – 108 с.

2. Беловежская пуща [Электронный ресурс] // Государственное природоохранное учреждение «Национальный парк “Беловежская пуща”». – Режим доступа: https://npbp.by/. – Дата доступа: 30.11.2023.